Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого»
Институт социологии НАН Беларуси
Гомельская областная организация общества «Знание»

*75-летию освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков посвящается*

# Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы

## Материалы XI Международной научной конференции

**Гомель, 23–24 мая 2019 года**

**Гомель**
**ГГТУ им. П. О. Сухого**
**2019**

УДК 316.334.52(042.3)
ББК 60.05
М50

Редакционная коллегия:

д-р социол. наук, проф. *В. В. Кириенко* (главный редактор)
канд. экон. наук, доц. *Н. В. Пархоменко*
канд. юрид. наук, доц. *С. П. Кацубо*
канд. экон. наук, доц. *О. В. Лапицкая*
канд. экон. наук, доц. *И. В. Ермонина*
канд. экон. наук, доц. *Е. А. Кожевников*
д-р ист. наук, проф. *С. А. Елизаров*
канд. филос. наук, доц. *В. К. Борецкая*
канд. филос. наук, доц. *А. Ю. Савенко*
канд. геогр. наук, доц. *Е. Н. Карчевская*

Рецензенты:

проф. каф. философии учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины» д-р филос. наук, проф. *В. Н. Калмыков*;
проф. каф. коммерции и логистики учреждения образования «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации» д-р экон. наук, проф. *А. И. Капштык*

Под общей редакцией д-ра социол. наук, проф. *В. В. Кириенко*

Подготовка и проведение конференции осуществлены на базе учреждения образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого»

М50 **Менталитет** славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : материалы XI Междунар. науч. конф., Гомель, 23–24 мая 2019 г. / М-во образования Респ. Беларусь [и др.] ; под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2019. – 171 с.

ISBN 978-985-535-414-8.

Приведены основные результаты исследований философов, социологов, экономистов, историков, культурологов, правоведов и политологов по истории и теории славянского менталитета, его интегрирующей роли в объединении славянских государств.

Для научных работников и преподавателей высших учебных заведений, политиков и журналистов, для аспирантов и студентов, изучающих социально-гуманитарные дисциплины.

**УДК 316.334.52(042.3)**
**ББК 60.05**

**ISBN 978-985-535-414-8**

© Оформление. Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого», 2019

# БЕЛАРУСКАЯ РЭЛІГІЙНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ: ПАСТАНОЎКА ПЫТАННЯ М. БАГДАНОВІЧАМ

**В. А. Адзіночанка**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Беларусь*

Актуальнасць разважанняў аб праблеме рэлігійнай ідэнтычнасці абумоўлена характарам таго пераломнага этапу, на якім зараз знаходзіцца Беларусь. Змены маюць фундаментальны характар, у тым ліку і ў галіне ідэнтычнасці: раней мы былі часткай вялікай краіны, зараз жа зрабіліся незалежнай дзяржавай. Таксама змяніліся віды ідэнтычнасці: яна стала больш разнастайнай і ўзмацнілася талерантнасць да яе праяў. У прыватнасці, рэлігійныя людзі ўжо не успрымаюцца як адсталыя і фанатычныя. Рэлігійная ідэнтычнасць зрабілася адным з аспектаў грамадскай ідэнтычнасці.

Даследчыкі падкрэсліваюць, што ў сучаснай сітуацыі «этнічная салідарнасць і рэлігійнасць выяўляюць асаблівую значнасць культурнага фактару ў працэсах грамадскай і палітычнай кансалідацыі краіны. Рэлігія становіцца адным з маркераў этнічнай ідэнтычнасці, фактарам палітыкі і працэсаў фарміравання грамадзянскай супольнасці» [1, с. 136].

Працэсы, якія сення адбываюцца ў нашым грамадстве, суадносяцца з пачаткам ХХ ст., калі жыў М. Багдановіч. У гэты час ідзе беларускае нацыянальнае адраджэнне, у цэнтры якога асэнсаванне сябе беларусамі як самастойнага народа.

Мы будзем абапірацца на наступнае азначэнне ідэнтычнасці: «Ідэнтычнасць (ад лат. identificare – атаясамліваць) – суаднесенасць чаго-небудзь («які мае быцце») з самім сабой у суладдзі і бесперапыннасці уласнай зменлівасці» [2, с. 382].

Ідэнтычнасць заўседы ўяўляе сабой праблему, для яе трэба намаганні. Таму мы лічым неістотным падзел ідэнтычнасцей на натуральныя і створаныя, які робяць некаторыя даследчыкі. Да першых адносяць этнічныя, расавыя, тэрытарыяльныя агульнасусветныя, да другіх – нацыянальныя, прафесійныя, рэлігійныя, класавыя ідэнтычнасці. Сцвярждаецца, што першыя, у адрозненне ад другіх, не патрабуюць намаганняў па сваей падтрымцы.

Мы выходзім з таго, што ідэнтычнасць уяўляе сабой культурнае ўтварэнне і не з'яўляецца натуральнай. Нават палавая ідэнтычнасць мае культурнае паходжанне і залежыць ад успрымання мужчыны і жанчыны ў дадзены час. Кожная з ідэнтычнасцей утрымлівае ў сабе розныя ступені чалавечай актыўнасці. Сучаснае грамадства прапануе шэраг ідэнтычнасцей і магчымасць іх змены.

Для нас зараз існуе тры фундаментальныя мадэлі культурнай ідэнтычнасці: як разнавіднасці ўсходняга славянства, як часткі заходнееўрапейскай культуры і ў аспекце прамежкавага становішча паміж Расіяй і Еўропай. Адпаведна фарміруюцца розныя рэлігійныя ідэнтычнасці. У першым выпадку ў цэнтры ўвагі знаходзіцца праваслаўе, якое ў штодзеннай свядомасці ўспрымаецца як рэлігія ўсходніх славян, у другім значэнне надаецца свабодзе сумлення і рэлігійнаму плюралізму, у трэцім акцэнт робіцца на ўзаемадзеянне, з аднаго боку, праваслаўя, з другога – каталіцтва і пратэстанцтва, якія лічацца духоўнай асновай, адпаведна рускай і еўрапейскай культуры.

Трэба падкрэсліць гістарычную абумоўленасць характару праблемы ідэнтычнасці. Для М. Багдановіча актуальным было, па-першае, адрозненне беларусаў ад рускіх і палякаў і, па-другое, раздзяленне культурнай і рэлігійнай ідэнтычнасці.

Пазначаецца праблема фарміравання нацыянальнай свядомасці і ідэнтыфікацыі сябе як беларусаў: «Вакол усе кажуць: я – паляк, я – літвін, я – жыд. А мы нават імя свайго народа забыліся. Вось і адмаўляем: я – праваслаўны, я – каталік. Але ж гэта названне нашай веры, а не нашага народа. Каталікі часам спрабуюць звацца палякамі, бо вера ў іх тая ж. Але варта толькі пачуць польскую гаворку, каб пераканацца, што гэ-

та не такі народ, як мы. Другія, а надта праваслаўныя, называюць сябе рускімі. Але калі глянуць на рускіх з-пад Масквы або з-пад Кіева, дык шмат у чым пабачым розніцу між намі ды імі» [3, с. 126].

Такім чынам, Багдановіч падкрэслівае фундаментальны характар не рэлігійнай, а нацыянальнай ідэнтыфікацыі: «Ёсць паміж нас праваслаўныя, есць і каталікі, але народ з нас адзін, бо ўва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песні, адна вопратка, адзін лад жыцця» [3, с. 126]. Багдановіч настойвае, што «розніца ў веравызнаннях не раскалвае беларускі народ на дзве непадобныя па культуры велічыні» [4, с. 91].

Падзел беларусаў па рэлігійным прыметам ў ХІХ ст. быў абумоўлены палітычнымі прычынамі, а менавіта палітыкай русіфікацыі і дэпаланізацыі: «выключна польскі выгляд касцела – з'ява ў нашым краі параўнальна нядаўняй фармацыі і прычым выкліканая нічым іншым, як «русіфікатарскімі» мерапрыемствамі ўрада» [5, с. 129]. Да гэтага ў праваслаўных і ўніяцкіх храмах шырока выкарыстоўвалася беларуская мова, на ей друкаваліся рэлігійныя тэксты.

Вялікае значэнне ў працэсе разбурэння нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў Багдановіч надае ліквідацыі ў 1839 г. уніі, «якая з'яўлялася ў краі нацыянальнай беларускай рэлігіяй і, адпаведна, нацыянальным цэментам» [6, с. 121].

Палітыка русіфікацыі ўзмацніла атаясамліванне каталіцтва з польскасцю. Таму, па меркаванні Багдановіча, ажыццяўленне праекта увядзення ў каталіцкае набажэнства рускай мовы замест польскай, як гэта планаваў у пачатку ХХ ст. расійскі ўрад, «будзе шэрай сялянскай масай зразумела як крок да замены каталіцтва праваслаўем» [5, с. 131].

Багдановіч робіць націск на негатыўную ідэнтычнасць, каб падкрэсліць адрозненне беларусаў ад рускіх і палякаў, бо ў пачатку ХХ ст. была рэальная пагроза разбурэння беларусаў як нацыі. Выказваліся думкі, што «існуюць толькі няўдалыя спробы стварыць такую нацыю» [4, с. 90]. Прапанаваліся праекты падзяліць беларусаў: «два мільены баларусаў-католікаў адлічыць да Польшы ў мэтах іх паланізацыі, астатнюю жа частку падвергнуць русіфікаванню, каб беларускі народ, так бы мовіць, «рассмактаўся» паміж дзвюма найбольш моцнымі суседнімі нацыямі» [4, с. 90].

Зараз актуальным з'ўляецца фарміраванне нашай культурнай традыцыі. Гэта патрабуе мэтанакіраваных дзеянняў, паколькі «намаганні гістарычнай свядомасці кампенсуюць небяспеку тэмпаральнага растварэння ідэнтычнасцей» [7, с. 97].

М. Багдановіч – адзін з класікаў нашай літаратуры і выдатны дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння. Прадуктыўна суаднесці ягоныя думкі з тымі праблемамі, якія існуюць зараз. Для рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі характэрна поліканфесійнасць. На 1 студзеня 2018 г. у краіне было зарэгістравана 3358 рэлігійных суполак, якія належаць да 25 накірункаў, сярод іх 1687 праваслаўных і 497 рымска-каталіцкіх. Згодна з заканадаўствам, праваслаўе і каталіцтва адыгралі значную ролю ў культурнай і дзяржаўнай традыцыі Беларусі.

Трэба ўлічваць, што зараз праблема фарміравання беларускай ідэнтычнасці мае іншы характар, чым гэта было ў пачатку ХХ ст., калі пісаў Багдановіч. На першы план выходзіць фарміраванне пазітыўнай ідэнтычнасці, гэта значыць, вызначэнне тых рысаў, якія ўласцівыя беларусам. Мы лічым, што яны не могуць быць зведзены да характарыстык менталітэту, такіх як талерантнасць, працавітасць і г. д., а выяўляюцца праз аналіз культуры і гістарычнай традыцыі.

Багдановіч рабіў націск на неабходнасці захавання народнай культуры і менавіта ў ей бачыў фундамент нацыянальнай ідэнтычнасці: «Не пакінем свае гаворкі, сваіх песень, сваіх звычаяў – свайго кроўнага, спрадвечнага, беларускага. Не адракомся, не забудзем, не кінем на глум; будзема шанаваць, бараніць, дзецям сваім аб тое запаведаць» [3, с. 127].

Зараз асноўнай перадумовай фарміравання беларускай ідэнтычнасці з'яўляецца наяўнасць самастойнай дзяржавы. Актуальнымі робяцца дзве задачы: па-першае, асэнсаванне свайго адрознення ад блізкіх нам у культурным плане народаў, па-другое, вызначэнне сваіх рысаў. Падкрэслім, што ідэнтычнасць не з'яўляецца дадзенасцю, а фарміруецца, у тым ліку і праз намаганні дзеячоў культуры і даследчыкаў.

Як і ў часы Багдановіча, актуальнай з'яўляецца праблема нацыянальнага адзінства. Палітызацыя рэлігіі прыводзіць да разбуральных наступстваў, перш за ўсе для яе самой. Мы гэта бачым на прыкладзе ісламу, а таксама расійскага праваслаўя. У сучаснай Беларусі неабходна фарміраваць пачуцце дзяржаўнага і культурнага адзінства. Канфесійныя адрозненні не павінны быць нагодай для падзелу.

Трэба выходзіць з традыцыйнай поліканфесійнасці беларускай культуры і талерантнасці беларусаў. Бачным увасабленнем апошняй з'яўляецца знаходжанне ў цэнтры шмат якіх беларускіх гарадоў адначасова праваслаўнай царквы, каталіцкага касцела і іўдзейскай сінагогі. Безумоўна, калі іх не разбурылі ў гады атэістычных рэпрэсій.

Ва ўмовах сучаснай Беларусі націск трэба рабіць на міжрэлігійны дыялог. Менавіта праз яго будзе фарміравацца рэлігійная сітуацыя ў краіне.

Для нас зараз каштоўнымі з'яўляюцца пытанні, пастаўленыя ў пачатку XX ст. дзеячамі беларускага нацыянальнага адраджэння. Адказы на іх трэба даваць, выходзячы з сучасных умоў.

Літаратура


1. Рыжова, С. В. Этноконфессиональная идентичность и формирование религиозных политических ориентаций / С. В. Рыжова // Социолог. исслед. – 2015. – № 10. – С. 136–144.
2. Абушенко, В. Л. Идентичность / В. Л. Абушенко // Всемир. энцикл. Философия / гл. ред. А. А. Грицанов. – М. : АСТ, Минск : Харвест, 2001. – С. 382–386.
3. Багдановіч, М. Хто мы такія? / М. Багдановіч // Поўны збор твораў : у 3 т. ; рэд. У. М. Конан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 3. – С. 126–127.
4. Багдановіч, М. О гуманизме и неосмотрительности / М. Багдановіч // Поўны збор твораў : у 3 т. ; рэд. У. М. Конан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 3. – С. 90–93.
5. Багдановіч М. На белорусские темы / М. Багдановіч // Поўны збор твораў: у 3 т. ; рэд. У. М. Конан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 3. – С. 128–134.
6. Багдановіч, М. Белорусы / М. Багдановіч // Поўны збор твораў : у 3 т. ; рэд. У. М. Конан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 3. – С. 119–125.
7. Люббе, Г. Историческая идентичность / Г. Люббе // Вопр. философии. – 1994. – № 4. – С. 94–107.


## ПРАЗДНОВАНИЕ ДНЯ ЕДИНЕНИЯ НАРОДОВ В ПРИГРАНИЧНЫХ ОБЛАСТЯХ БЕЛАРУСИ И РОССИИ


**С. А. Приходько**

*Новозыбковский краеведческий музей, Россия*


Дружбе народов в глобальном измерении посвящены многие публикации [1], [2], но не менее важным представляется приграничное сотрудничество.

**Красный Камень, 2015 г.** 2 апреля торжественные мероприятия прошли в Гомеле. Делегации братских стран встретились в Гомельской области, в поселке Красный Камень Добрушского района, который расположен на границе государств. Жителей Брянской области встречали хлебом-солью.

В Гомельском областном драматическом театре прошел праздничный концерт и открылась тематическая выставка декоративно-прикладного искусства. Брянскую область представили образцовый ансамбль танца «Грация» Дятьковской детской хореографической школы и мастера декоративно-прикладного искусства.

Параллельно 2 апреля в Брянске состоялся праздничный концерт с участием образцового хора мальчиков и юношей хорового отделения Светлогорской детской шко-